№ 3 (356)
Студзень 2011 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

У нумары:

☞ Досвед і прапанова: *зніклыя вёскі* – *стар. 3*

☞ Рэгіён: *Сэрвач, што каля Карэлічаў* – *стар. 5*

☞ *Просты лёс: «свеціць трывушчае сэрца»* – *стар. 6*

«Святое Васілля – людзям красілля»

Шчадрэц на Каляды

Нядаўна ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту была арганізаваная імпрэза з нагоды каляднага свята «Шчадрэц», які традыцыйна адзначаецца ўвечары і ноччу з 13 на 14 студзеня.

Да музейшчыкаў і гасцей завіталі Шчодрыца са Шчодраю (іх ролі выконвалі артысты фальклорнага калектыву «Шчодрыца»), калядоўшчыкі з Мінскага Палаца пазашкольнай працы «Золак», з Маладзечна і Бараўлянаў. На каляднай сцэне прадэманстравалі сваё майстэрства і іншыя фальклорныя калектывы Мінска і вобласці. Пад час свята прайшоў конкурс на лепшую калядную зорку. Непадалёк студэнты БДУ культуры і мастацтваў ладзілі народныя забавы. Былі і калядныя пачастункі, а таксама ганаровыя госці – міністр культуры Павел Латушка, прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу.

«Цвіком» праграмы свята стала прадстаўленне абрада «Калядныя Цары» ў выкананні народнага калектыву з вёскі Семежава Капыльскага раёна, які ў пачатку года адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Асаблівасць гэтага абрадаў у тым, што ён праводзіцца на шчодры вечар толькі ў адной вёсцы Капылышчыны – у Семежаве. Яго ўдзельнікамі з'яўляюцца толькі мужчыны: юнакі і нежанатыя мужчыны – Цары. Усе апранутыя ў белыя штаны і кашулі, падпяразаныя традыцыйнымі чырвонымі тканымі паясамі і павязаныя імі на грудзях крыж на крыж, а таксама хусткамі. На нагах у іх – чорныя скураныя боты, на галаве – высокія шапкі з рознакаляровымі папяровымі стужкамі. Акрамя Цароў бяруць удзел Лекар, Дзед з Бабай і Механоша.

Працэсія Цароў наведвае хаты аднавяскоўцаў і разыгрывае сцэнку «Бітва цароў Максіміліяна і Мамая». У імправізаваным паядынку цар Максіміліян перамагае Мамая, і той памірае. Тут прыходзіць Лекар, пачынае яго лячыць і ажыўляе забітага. Пад час прадстаўлення Механоша збірае калядныя пачастункі і грошы. Завяршаецца прадстаўленне кругавым танцам, традыцыйным віншаваннем цара Максіміліяна гаспадароў і адорваннем удзельнікаў абраду. Лічыцца, што калі Цары зойдуць у хату – год для гаспадароў будзе багаты і ўдалы. Калі пачынае цямнець, Цары запальваюць паходні і ходзяць па вёсцы з імі. Пры наведванні хатаў перавага аддаецца тым, дзе жывуць незамужнія дзяўчаты. Пасля абыходу Цары наладжвалі традыцыйную калядную гулянку, на якую запрашалі дзяўчатаў.

Абрад з'явіўся ў XVIII ст., калі ў вёсцы размяшчаўся конны атрад рускага царскага войска, што пацвярджаецца гістарычнымі крыніцамі. Салдаты і афіцэры ў сваёй форме хадзілі на Нараджэнне Хрыстова па хатах і ладзілі прадстаўленне пра цара Максіміліяна, а гаспадары аддзячвалі ласункамі. Пасля таго, як атрад пакінуў вёску, абрад пачалі выконваць мясцовыя юнакі. Традыцыя захавалася да 1960-х гадоў. Таму ў прадстаўленні шмат рускіх словаў і выконваецца руская песня: «Посею лебеду на берегу».

Апошні раз Цары хадзілі ў 1958 годзе. Потым традыцыя была страчаная. У 1996–1997 гадах група этнографаў пад кіраўніцтвам Таццяны Кухарэнкі працавала ў Семежаве і знайшла жанчыну, якая расказала пра старадаўні абрад. У 1997 годзе па яе расповедах традыцыя хаджэння Цароў на Шчадрэц была адноўленая і пачала штогод выконвацца. У асобныя гады нават было па некалькі гуртоў Цароў, якія дзялілі між сабой тэрыторыю абыходу.

Бой Мамая з царом Максіміліянам

У тым жа 1997 годзе рэжысёрам Ірынай Волах быў зняты дакументальны фільм «Калядныя Цары».

Дзякуючы ўнікальнаму абраду вёска стала вядомая далёка за межамі Беларусі. А ў 2009 годзе абрад быў унесены ў спіс Сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, дыплом жа ЮНЕСКА атрымаў летась пад час фестывалю «Берагіня». Цяпер ідзе праца па прадстаўленні да рэгістрацыі ў названым спісе рэгіянальнага элемента «Палескі калядны фестываль».

Зм. ВОЖЫК,
фота аўтара

…І англамоўныя Ясь ды Вераніка

У гэтым ёсць нейкая сімволіка – зусім нядаўна скончыліся ўрачыстасці з нагоды юбілею Уладзіміра Караткевіча, і адразу за імі – ушанаванне іншай выбітнай постаці нашай культуры. Толькі калі Караткевіч нарадзіўся ў Беларусі, а для нацыянальнага ўзгадавання яму шмат дала Украіна, то рускі юнак Уладзімір Мулявін апынуўся ў БССР ды тут і прыкіпеў да нашай нацыянальнай культуры. Амаль адначасова яны заззялі ў сузор'і выдатных дзеячаў культуры Беларусі.

Пачаў творчую дзейнасць у Беларусі Мулявін у 1962 годзе пасля службы ў Савецкай Арміі. Праз сем гадоў ён – ужо мастацкі кіраўнік



Леанід Бароўскі

створанага ім ансамбля «Лявоны», які праз нейкі час атрымаў новую назву – «Песняры». У творах ансамбля (многія – аўтарства самога мастацкага кіраўніка) былі паяднаныя народная паэзія, песня і музыка з сучаснымі музычнымі прыёмамі і падыходамі. Цікава, што на той час прыпадае дзейнасць падобных савецкіх калектываў – рускага «Ариэль», грузінскага «Ореро», узбекскага «Нурок» ды іншых. У рэпертуары некаторых ансамбляў з'яўляюцца асобныя песні – апрацоўкі фальклору ці зробленыя ў народнай стылістыцы. Але вельмі шырокую вядомасць і жывучасць набылі толькі «Песняры». Можа, не ў апошнюю чаргу дзякуючы арганізатарскім здольнасцям Мулявіна ды таму, што ансамбль атрымаў статус дзяржаўнага канцэртнага (за што іх называлі прыдворным калектывам). Артысты неаднаразова выступалі за межамі нашай краіны, і дзякуючы гэтым гастролям пра нас даведваліся ў свеце, адкрывалі для сябе, што ў Савецкім Саюзе ёсць розныя нацыі з сваёй адметнай культураю – у тым ліку і беларусы. А пад час гастроляў «Песняроў» у Злучаных Штатах, дзе на канцэртах бывалі і эмігранты-беларусы, для некага іх творчасць была яшчэ вяртаннем, хаця б у марах, на Радзіму. І сведчаннем таго, што Беларусь, беларуская культура, народныя традыцыі не толькі жывуць, але і развіваюцца.



Леанід Бартлаў з падарункам для музея

Пра гэта і пра шмат іншае ішла гаворка на вечарыне, прысвечанай 70-годдзю з дня нараджэння народнага артыста Беларусі і СССР Уладзіміра Мулявіна, 12 студзеня ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь. На імпрэзу завіталі сённяшні кіраўнік «Песняроў» Вячаслаў Шарапаў, мастакі Леанід Бартлаў і Юрый Піскун, якія працавалі з артыстамі ансамбля. Пасля ўступнага слова дырэктара музея Зінаіды Кучар выступалі госці. Яны падзяліліся развагамі пра асобу Мулявіна, ягоны ўнёсак у нацыянальную культуру, распавялі пра свае стасункі з ім. Л. Бартлаў падараваў музею адзін з колішніх эскізаў канцэртных строяў «Песняроў».

Асобным блокам стала прадстаўленне амаль невядомага запісу ансамбля і расповед пра яго Леаніда Бароўскага (намесніка старшыні БФК, а ў сярэдзіне 1970-х гадоў кіраўніка гастроляў «Песняроў» у ЗША, ці – як называюць яго на сучасны манер – іх першы «PR-manager»). Гэта запісаны на магнітафонную стужку (на вялікую бабіну) рабочы варыянт сумеснай працы «Песняроў» з амерыканскім гуртом «New Christie minstrels», зроблены ў 1976 годзе ў студыі грамзапісу «Columbia CBS» у горадзе Нэшвілі. Усяго запісана пяць песень: «Купалінка», «Касіў Ясь канюшыну», «Вераніка», «Добры вечар, дзяўчыначка», «Расцвела сирень». Цікава, што творы гучаць на трох мовах – ёсць і англамоўныя ўстаўкі, праспяваныя амерыканскімі калегамі.

– Ідэя запісу для нас была нечаканаю, – распавёў Л. Бароўскі. – Што называецца, «з колаў». Загадзя нас папярэдзілі, што будзе 10 канцэртаў і, магчыма, 11-ы. Дык вось замест адзінаццатага быў якраз гэты запіс. Хутка былі зробленыя пераклады на англійскую мову, прайшла невялікая рэпетыцыя… Сам запіс абмежаваўся адным днём.

– А хто рабіў пераклад?

– Па-шчырасці, і не адкажу. Хутчэй за ўсё, нехта з мясцовых. Верагодна, далучылася і перакладчыца дэлегацыі «Песняроў» Наталля Пархоменка.

– Запіс так і застаўся рабочым?

– Не. Ведаю, што выйшла вінілавая кружэлка (так званая саракапятка) накладам 500 асобнікаў, якая разышлася ў ЗША.

Такім чынам, яшчэ адзін наробак з творчай спадчыны славутага калектыву, які праіснаваў больш за 30 гадоў, стаў даступны. Праўда, пакуль толькі даследчыкам, бо пра тыражаванне размова не ідзе.

Акурат да вечарыны ў музеі была прадстаўленая і выстаўка, прысвечаная Уладзіміру Мулявіну, – нотныя рукапісы, фотаздымкі, эскізы сцэнічных строяў, партрэты спевака і кампазітара.

Уладзімір ПІРОГ,
фота аўтара

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

АБАНЕМЕНТ *на газету* 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Колькасць камплектаў

на 200_ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету 63320 (індэкс выдання)

Краязнаўчая газета

Кошт: падпіскі _____руб. пераадрасоўкі _____руб. Колькасць камплектаў

на 200_ год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Кошты на падпіску на нашую газету на 1 паўгоддзе 2011

Індывідуальная падпіска	**Індэкс 63320**
1 месяц	5 430 руб.
3 месяцы	16 290 руб.
6 месяцаў	32 580 руб.
Ведамасная падпіска	**Індэкс 633202**
1 месяц	5 660 руб.
3 месяцы	16 980 руб.
6 месяцаў	33 960 руб.

У 2011-м спаўняецца

145 гадоў таму нарадзіўся **Снітка Андрэй Канстанцінавіч** (1866–1920), беларускі этнограф, краязнаўца, музеязнаўца.

115 гадоў таму нарадзілася **Кіш Алена Андрэеўна** (1896–1949), беларускі майстар дэкаратыўна-ўжытковага інсітнага мастацтва.

110 гадоў таму нарадзілася **Вержбаловіч** (Вербіч) **Барбара Іванаўна** (1901–1967), беларуская спявачка. З 1944 г. жыла за мяжой.

105 гадоў таму (1906) быў створаны **Віцебскі музычна-драматычны гурток**. Існаваў да 1914 г.

105 гадоў таму нарадзіўся **Галубок Эдуард Уладзіслававіч** (1906–1943), беларускі фальклярыст, літаратуразнаўца і крытык.

105 гадоў таму нарадзіўся **Гарох Янка** (1906–?), паэт, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

105 гадоў таму (1906) была заснаваная **друкарня Марціна Кухты** ў Вільні. Існавала да 1916–1917 гг.

95 гадоў таму (1916) была заснаваная **«Беларуская хатка»**, клуб беларускай мастацкай інтэлігенцыі. Існавала да 1922 г.

95 гадоў таму (1916) быў створаны **Беларускі клуб у Вільні** пад старшынствам І. Луцкевіча. Існаваў да 1920 г.

95 гадоў таму (1916) быў заснаваны тэатральны калектыў **«Беларуская драматычная дружына»** пры Беларускім клубе ў Вільні. Існаваў да 1918 г.

90 гадоў таму (1921) было створанае **таварыства беларускай нацыянальнай меншасці ў Латвіі «Бацькаўшчына»**. Існавала да 1925 г.

90 гадоў таму (1921) пачалі выходзіць з друку **«Беларускія ведамасці»**, штотыднёвая грамадска-палітычная літаратурная газета на беларускай мове. Выдавалася да 15 студзеня 1922 г. у Вільні.

90 гадоў з часу заснавання (1921) **Беларускага музея імя І. Луцкевіча** ў Вільні, адной з галоўных навуковых і асветніцкіх установаў у гісторыі Беларусі. Існаваў да 1946 г. Большасць збораў цяпер захоўваецца ў найбуйных музеях Літвы і Беларусі.

90 гадоў таму (1921) была заснаваная **Нацыянальная бібліятэка Беларусі**.

90 гадоў таму (1921) было створанае **Таварыства беларускай школы** (ТБШ), культурна-асветная арганізацыя працоўных Заходняй Беларусі. Існавала да 1936 г.

З досведу працы

Інфармацыя пра зніклыя вёскі

Паважаныя аднадумцы!

Вядома, што ў гісторыі Беларусі, нават у яе найбольш вывучаных апошніх пяці стагоддзях, ёсць шмат вызначальных для лёсу беларускага народа падзеяў, але пра іх збераглося мала аб'ектыўных гістарычных дакументаў. І былі на гэта розныя прычыны.

Ваенныя ліхалецці, пажары, унутранае бязладдзе, слабая нацыянальная свядомасць нацыянальнай інтэлігенцыі ў той час, пераследы лепшых прадстаўнікоў апошняй ідэалагічнымі службамі дзяржаваў-заваёўніцаў, знаходжанне архіваў за межамі краіны і г.д.

Здавалася б, што гістарычныя з'явы XX стагоддзя, як бліжэйшыя да нас, больш маюць інфармацыйных матэрыялаў для шырокага кола зацікаўленых. Але гэта не так, па прынцыповых праблемах – у першую чаргу.

Асабліва не хапае аб'ектыўных матэрыялаў пра рэпрэсіі 1929–1956 гадоў у Беларусі. На вялікі жаль, гэтая праблема тычыцца тым ці іншым чынам ледзь не кожнага другога грамадзяніна краіны. Лічыце самі: у Беларусі рэпрэсіямі розных формаў, па неафіцыйных падліках, закранута каля 1 мільёна чалавек. І яшчэ сотні тысячаў былі ў той час судовымі супрацоўнікамі, наглядчыкамі ў турмах, адміністрацыях усіх узроўняў і г.д.

Зараз Беларусь – самастойная краіна, і ніхто звоніку яе не падпіхвае на замоўчванне дзікунства.

Ці не варта было б хоць для асэнсавання саміх сябе праўдзіва зірнуць на тую жудасную частку жыцця папярэдніх пакаленняў; без прынцыпу «вока за вока», па-людску, на дзяржаўным узроўні даследаваць як мага больш таго мінулага, яшчэ раз пашукаць неўзгаданыя кнігамі «Памяць» прозвішчы, хутары, вёскі, даты рэпрэсіяў. У асобных кнігах «Памяць» нават няма сур'ёзнага ўспаміну пра рэпрэсіі (Ляхавіцкі, Камянецкі, Валожынскі, Лагойскі раёны). А ў астатніх гэтая трагедыя занатаваная ці не на адну траціну ад таго, што было.

Прыклады магу прывесці з блізкага мне Капыльскага раёна Мінскай вобласці. З 202 населеных пунктаў раёна ў 159 адбыліся рэпрэсіі. Сціплыя помнікі пра гэтую жудасць існуюць у трох вёсках і г. Капылі. Па найлепш вывучаных вёсках раёна – Чарнагубава і Выня – рэпрэсаваныя па 74 і 73 чалавекі адпаведна, прыкладна з 120 хатаў. У час вайны ў кожнай вёсцы загінулі 25 і 39 чалавек адпаведна. Афіцыйныя адказы ў свой час давалі лічбы іншыя: рэпрэсаваных у в. Чарнагубава было 23 чалавекі, а ў в. Выня – 17 чалавек і 3 сям'і. Зразумела, што колькасць ахвяраў заніжаная ці не ў тры разы. Зразумела, што з-за недахопу інфармацыі ў першую чаргу, і іншых прычынаў.

Але маўчыць дзяржава. Выплаціўшы ў свой час за кожную ахвяру нашчадкам па 2 мінімальныя заробкі (гэта каля 60 даляраў), яна палічыла сваю справу выкананай, а беларуская грамадскасць аказалася няздольнай да самааб'яднання, маштабнага і грунтоўнага, і не змагла ўзяць справу ў свае рукі.

Не зразумелай з'яўляецца і абыякавасць сучаснай улады да гэтых людзей. Думаю, што і Прэзідэнту А.Р. Лукашэнку не вядома, што каля 30 помнікаў, у асноўным сямейнага тыпу, пабудавана ў краіне ў памяць ахвяраў намаганнямі грамадскасці. Дзяржавай – ні аднаго!

Блізкая да дзяржаўнай фактычна і лінія апазіцыі. Маўчанне амаль усіх кіраўнікоў партыяў, акрамя двух БНФ, сведчыць, на мой погляд, пра іх недастатковую дзяржаўную свядомасць, неразуменне велічыні катастрофы народа пад час рэпрэсіяў, недастатковае веданне праблемы. У кожнай праграме гэтых партыяў запісаныя клопат пра чалавека, а рэальны клопат пра 1 мільён нявінных ахвяраў адсутнічае! Не чутно нідзе пра пабудаваны імі помнік ахвярам, іншую форму дапамогі нашчадкам.

І яшчэ раз пра дзяржаву. Савецкая ўлада зрабіла вялікую і ўдзячную працу праз выяўленне і ўсталяванне помнікаў героям і ахвярам Вялікай Айчыннай вайны. Сучасная ўлада дбайна і годна, так, як і трэба, даглядае 10 000 такіх помнікаў. А турбавацца пра ахвяры рэпрэсіяў ім, мусіць, не хапае духоўнасці.

Існуюць разлікі, якія даюць лічбу – 106 перасяленых ад мяжы паселішчаў, у асноўным, дробных (да 15 хатаў)

Што мяне яшчэ турбуе? У 1935–1938 гг. пад час умацавання савецка-польскай і латышскай мяжы былі збудаваныя абарончыя аб'екты на падставе зараз вядомых пастановаў ЦК КП(б)Б ад 4 ліпеня 1935 года, ЦК і СНК БССР № 150-с ад 26 ліпеня 1935 года, ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 14 жніўня 1935 года. Тады было прынятае рашэнне аб пераносе і абазначаны спіс хутароў і вёсак, якія падлягаюць высяленню за межы 500-мятровай ахоўнай зоны дзяржаўнай мяжы, разам з людзьмі ва ўнутраныя раёны Беларусі і на поўнач СССР. Потым гэтая зона дзенідзе пашырылася да 7,5 км ад мяжы на ўсход.

У дзяржаўных цэнтральных рассакрэчаных зараз архівах гэты спіс узгадваецца, але не прыводзіцца. Пры гэтым існуюць разлікі, якія даюць лічбу – 106 перасяленых паселішчаў, у асноўным, дробных (да 15 хатаў). Але існавала і іншая практыка: у Капыльскім раёне была цалкам выселеная з памежнай зоны в. Белікі. Паводле перапісу 1926 г. у ёй было 43 двары і 200 жыхароў. У Жыткавіцкім раёне, таксама паводле інфармацыі кнігі «Памяць», былі выселеныя вёскі Багушы і Рудня.

Выканкамы раёнаў, раённыя музеі на запыты пра зніклыя вёскі не адказваюць. Відаць, не цікавяцца гэтаю тэмай.

Паважаныя аднадумцы!

Зараз існуюць спісы памежных раёнаў на 1935–1938 гг. з іх карэктывамі, іх сучасныя назвы даюцца ніжэй.

Па ўсіх гэтых раёнах маюцца спісы зніклых за 1935–1956 гг. населеных пунктаў. Але практыка паказала таксама, што рэпрэсаваныя вёскі, як ні дзіўна, у асобных раёнах знаходзяцца па-за гэтымі спісамі.

Без вашай дапамогі з месцаў знайсці гэтыя вёскі і хутары амаль немагчыма.

Яны патрэбныя для чалавечых успамінаў, усталявання помнікаў, прысваення назваў школам, вуліцам і г.д. Усё гэта паспрыяла б утрыманню духоўнасці нацыі. І тут асаблівая надзея на маладых. Толькі іх светлыя галовы, духоўна ўмацаваныя, змогуць з дапамогай старэйшых выканаць гэтую справу.

Я маю на ўвазе перш за ўсё некалькі катэгорыяў моладзі: нашчадкаў ахвяраў, студэнтаў гістарычных ВНУ, хрысціянскую моладзь пры цэрквах, касцёлах і іншых культавых цэнтрах, моладзь партыяў і г.д.

Калі мы забудземся на рэпрэсіі, жах можа паўтарыцца!

З павагаю –

Станіслаў ЛІСОЎСКІ

№ п/п	Памежныя раёны БССР	Раёны, што зараз не існуюць, час існавання	Сучасная назва раёна	Наяўнасць спісаў па гадах	
				1924–1935	1937–1946
1	2	3	4	5	6
1.	Дзяржынскі	Койданаўскі – да 1932 г.	Дзяржынскі	1932	–
2.	Капыльскі	–	Капыльскі	1935	–
3.	Асвейскі	Асвейскі 1925–1959	Верхнядзвінскі	–	–
4.	Дрысенскі Ветрынскі	Дрысенскі 1940–1959 У Мёрскі, з 1960 – у Полацкі Ветрынскі з 1959 г.	Полацкі	–	–
5.	Ушацкі		Ушацкі	–	–
6.	Бягомльскі	Бягомльскі 1924–1969	Докшыцкі	Бягомль 1925	–
7.	Плешчаніцкі	Плешчаніцкі 1924–1930, 1928	Лагойскі	Лагойскі 1933	–
8.	Уздзенскі		Уздзенскі	1933	–
9.	Мінскі Заслаўскі	Заслаўскі да 1959 г.	Мінскі	–	–
10.	Чырвонаслабодскі Старобінскі	Чырвонаслабодскі 1924–1927, 1935–1938	Салігорскі	Чырвонаслабодскі 1934 г. Старобінскі 1939	–
11.	Тураўскі	Тураўскі, да 1954 – у Гомельскай вобл., з 1962 – у Жыткавіцкім раёне	Жыткавіцкі	–	–
12.	Жыткавіцкі Лельчыцкі		Лельчыцкі	–	–

Рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» вырашыла надрукаваць зварот Станіслава Лісоўскага як працяг распачатай раней тэмы зніклых вёсак. Тэма рэпрэсіяў вельмі балючая для нашага краю і, згодны з аўтарам, актуальнасць яе не змяншаецца з часам.

Хто яшчэ, як не краязнаўцы, маглі б дапамагчы дзяржаве ў вывучэнні цьмяных, недаследаваных старонак нашай гісторыі, старонак, якія нанеслі глыбокую рану на цела нацыі.

Мы таксама вырашылі надрукаваць і прапанаваную С. Лісоўскім форму ўліку такіх вёсак, што можа служыць прыкладам будучым краязнаўцам-даследчыкам для адзінага падыходу да збору інфармацыі.



Вядомы і невядомы

У гісторыі нашай краіны шмат асобаў, якія пакінулі пасля сябе значны след. Хтосьці з іх большы, іншыя – меншы. Але заўсёды з упэўненасцю можна сказаць, што менавіта з іх складаецца вялікая кніга жыцця нашага народа. Гартаючы яе старонкі, часам па-новаму ўсведамляюцца розныя падзеі, пераацэньваецца ўнёсак вядомых асобаў, адкрываюцца новыя імёны.

Зараз хочацца ўспомніць адну з такіх асобаў, якой сёлета споўнілася 120 гадоў з дня нараджэння. Гэта – палітычны дзеяч пачатку XX ст. Лявон Заяц. Леанард Іосіфавіч уваходзіў у склад Народнага сакратарыята Беларусі, загадваў канцылярыяй і быў дзяржаўным сакратаром у Радзе БНР, з'яўляўся кансультантам Наркамфіна БССР.

Перш чым стаць палітычным дзеячам, Л. Заяц атрымаў вышэйшую адукацыю і напоўніўся неўтаймаванай любоўю да роднага краю, ідэямі нацыянальна-вызваленчага руху. Родам з Вілейшчыны, Леанард на некалькі гадоў апынуўся ў Пецярбургу, дзе вучыўся ва ўніверсітэце. Як і шмат іншых студэнтаў з нашага краю, ён імкнуўся да беларускага руху, таму і далучыўся да Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта.

Мэтай гуртка было азнаямленне з грамадскім і духоўным жыццём Беларусі. Працавалі розныя секцыі, наладжваліся беларускія вечарынкі. Тады Беларусь не мела яшчэ прафесійнага нацыянальнага тэатра. І адным з накірункаў працы гуртка была якраз аматарская тэатральная дзейнасць. Леанард не заставаўся ў баку ад гэтага, цікавіўся беларускай літаратурай, у тым ліку і драматургіяй. Хаця з апошняй было даволі складана: яе амаль не было. Але аматары тэатральнай творчасці знаходзілі выйсце, перакладаючы творы іншых аўтараў. Вядома, што 15 лістапада 1911 г. у тэатральнай зале «Пальма» адбыліся 2 спектаклі – «Міхалка» і «У зімовы вечар», якія ставіў артыст Александрыйскага тэатра К. Бэкін-Драздоў. У праграме гэтай вечарынкі пазначана і імя Л. Зайца: у п'есе паводле Э. Ажэшкі «У зімовы вечар» ён іграў ролю Падарожнага, а таксама выступаў як дэкламатар вершаў, выконваючы «Грамафон» А. Паўловіча. Гэта, дарэчы, не адзіны яго выступ. Паводле ўспамінаў Паўліны Мядзёлкі, Л. Заяц быў задзейнічаны і ў п'есе Янкі Купалы «Паўлінка» (іграў Якіма Сароку). Гэта самы першы паказ спектакля, на якім прысутнічаў і сам аўтар. Можа, Л. Заяц і не быў выдатным акцёрам і яму не хапала для гэтага здольнасцяў, але адно бясспрэчна – ён быў усё ж такі чалавекам творчым і зусім не абдзелены талентам. А яго ўдзел у тэатральным жыцці яшчэ не вывучаны.

На літаратурнай старонцы кнігі жыцця беларускага народа Л. Заяц пакінуў след дзякуючы сваім успамінам пра Максіма Багдановіча. Вельмі карысныя яны для нас тым, што праз іх адкрываецца заслона часу, і мы маем магчымасць уявіць сабе ўладкаванне побыту паэта, даведацца пра ўласцівыя яму рысы характару, яго патаемнае жаданне. Рэч у тым, што з М. Багдановічам Л. Заяц быў суседам па вуліцы: яны жылі на адным панадворку па Малагеоргіеўскай, дом № 12. Лявон не раз заходзіў да паэта, пра што і пісаў у сваіх успамінах. Паводле словаў Зоські Верас, Леанард прыехаў у Мінск, як і Максім, увосень 1916 г. І, што самае цікавае, таксама жыў на правах кватаранта, але не ў Змітрака Бядулі, як Багдановіч, а ў П. Алексюка. І нават наведвалі абодва адно месца – «Галоўны беларускі штаб» (так Заяц называў «Беларускую хатку»), дзе, дарэчы, і пазнаёміліся. Адказным сакратаром Мінскага аддзела Усерасійскага земскага саюза Леанард Іосіфавіч працаваў у той жа перыяд, што і Максім Адамавіч сакратаром губернскага харчовага камітэта – у 1916–1917 гг. Акрамя таго, абодва хварэлі на сухоты. І нават маглі б хадзіць па адных сцежках у Пецярбургу (у Пецярбургскі ўніверсітэт у свой час меўся паступаць і Багдановіч).

Што тычыцца паэзіі, то не быў далёкі ад яе і Леанард Заяц. Інакш навошта б тады М. Багдановіч з ім *«дужа ахвотна гутарыў аб паэзіі і аб апрацаванні вершаў»*. А Лявон *«разглядаў яго некаторыя заметкі, дзе ён старанна "правяраў матэматыкай" [поверял алгеброй], як пушкінскі Сальеры, свае вершы-музыку; вершы іншых аўтараў, што яго зацікавілі, ён тут жа па кніжцы размяраў на стапы і правяраў іх па ўсіх правілах вершавання»*.



Л. Заяц

Мастак А. Крывенка

Заходзіў і Багдановіч да Лявона Зайца, дзе любіў забаўляцца і гутарыць з разумным і забаўным хлопчыкам гадоў 5–6 (сынком Алексюка). Тут Леанард яшчэ раз прыкмеціў, як моцна любіць Максім дзетак: шчырасцю і болем веялі яго словы пра жаданне мець *«такога ж хлопчыка»*...

Л. Заяц быў на год старэйшы за славутага паэта, жыццёвы шлях яго аказаўся крыху даўжэйшым за Максімавы. Багдановіч толькі планаваў прыняць удзел ва Усебеларускім з'ездзе 1917 г., а Зайца ў 1918-м абралі членам Рады БНР. Багдановіч застаўся толькі паэтам, празаікам, перакладчыкам і крытыкам. Л. Заяц абраў палітыку, якая не пашкадавала многіх яе дзеячаў. Не быў выключэннем і Леанард Іосіфавіч. Калі пачалася «чыстка апарата», яго звольнілі з працы і ў 1930 г. арыштавалі па справе «Саюз вызвалення Беларусі». Пасля была пяцігадовая высылка ва Уфу. А 1935 г. – зноў арышт. Хворы на сухоты, Л. Заяц не вытрымаў турэмнага зняволення пад час следства, памёр.

Леанард Заяц не стаў зоркай на небасхіле нашай гісторыі, але як тая планета, уваходзіць у зорны сусвет і не можа не аказваць свой уплыў на агульны збег падзеяў у часе.

Таццяна ЛАБАДА

Прадаўжальнікі

Каб беларусам жылося-елася ды спяваць хацелася!

Сёння многія ўпікаюць сучасную моладзь у тым, што яна, маўляў, прыйшла на ўсё гатовенькае, створанае старэйшым і сярэднім пакаленнямі. І можна пачуць нават, што амаль усе маладыя людзі – практычныя, карыслівыя ды жадаюць атрымаць усё адразу, нічога не даўшы людзям узамен... Але гэта зусім не так. Да прыкладу, Уладзімір Александронец. Студэнт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, выдатнік вучобы, няўрымслівы актывіст, сапраўдны патрыёт свайго краю.

Мяркуйце самі. На базе Руднямарымонаўскай сельскай бібліятэкі пры непасрэднай падтрымцы бібліятэкаркі Тамары Бандарэнка Уладзя стварыў этнаграфічны музей-лабараторыю імя Е.Р. Раманава, згуртаваў каля сябе мясцовую моладзь, школьнікаў. Юнак не сядзіць склаўшы рукі, а знаходзіцца ў творчым пошуку. Вось і нядаўна ў сельскім Доме культуры адбылося трэцяе рэгіянальнае фальклорнае свята «Піліпаўскія вячоркі».

Варта падкрэсліць, што менавіта аматарскае аб'яднанне «Таварыства імя Еўдакіма Раманава» з'яўляецца ініцыятарам гэтага цікавага мерапрыемства, на якое прыехалі многія госці і прадстаўнікі мясцовай улады: дырэктар Гомельскай РЦБС Святлана Данчанка, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу РЦБС Таццяна Мачалава, галоўны бібліёграф РЦБС Наталля Бугрынец, вядучы метадыст па святах і абрадах Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці Людміла Мельнікава, метадыст па этнаграфіі і фальклоры Ірына Глушэц, кіраўнік аддзялення «Рудня Марымонава ААТ "Саўгас-камбінат "Сож"» і дэпутат раённага Савета дэпутатаў Ганна Маёрава ды іншыя.

Госці на ўласныя вочы пабачылі, як даўней праходзілі вячоркі ў гомельскім рэгіёне, як цікава праводзілі свой вольны час моладзь і замужнія кабеты. Фальклорны калектыў «Рамонкі», якім кіруе Віктар Задарожны, весела, з імпэтам стварыў належны пазітыўны настрой у гледачоў. Самадзейныя артысткі разам з мясцовымі школьнікамі па-майстэрску перадалі народныя звычаі і абрады. Звонкімі спевамі ды танцамі яны дапамаглі многім зразумець, што нашыя абрады і звычаі таксама заслугоўваюць агульнай увагі і дэталёвага вывучэння.

Як зазначыў Уладзімір Александронец, з даўніх часоў прыйшоў у нашыя мясціны цікавы звычай правядзення вечароў у перыяд Піліпаўскага (Каляднага) посту. Вячоркі – гэта вясёлае ігрышча з песнямі, танцамі, жартамі. Менавіта доўгімі піліпаўскімі вечарамі нашымі бабулямі былі зробленыя самыя прыгожыя, разнастайныя вышыванкі ды іншыя цікавыя вырабы. Галоўнае цяпер для сучаснікаў – каб доўгая нітка жывой повязі з мінулым не абарвалася!

Ганна АТРОШЧАНКА,
Гомельскі раён

На фота аўтара: (злева) кіраўнік фальклорнага гурта «Рамонкі» Віктар Задарожны, бібліятэкар Руднямарымонаўскай сельскай бібліятэкі Тамара Бандарэнка, каардынатар круглага стала Уладзімір Александронец

Была вёска Сэрвач...

Калі ўзнікла вёска Сэрвач Карэліцкага раёна, дакладна невядома, але першая пра яе згадка адносіцца да 1683 года, калі сяло налічвала 32 дымы і належала сям'і Маскевічаў. У 1777 годзе Сэрвач была ўжо цэнтрам аднайменнага маёнтка, які належаў навагрудскаму ваяводу Несялоўскаму. У склад маёнтка ўваходзілі сяло, карчма, вадзяны млын, капліца (відаць на мясцовых могілках), сыраварны завод. На той час у вёсцы было больш за 100 двароў. У 1840 годзе тут была адкрытая школа пісьменнасці, а ў 1912-м – народнае вучылішча.

У Сэрвачы існавала Свята-Крыжаўзвіжанская царква, пабудаваная, магчыма, яшчэ напрыканцы XVI стагоддзя і знішчаная, відаць, у пачатку XVIII стагоддзя пад час вайны са шведамі. Але ёсць і іншая версія. Некалі ў сэрвацкім двары быў кальвінскі збор. Такія былі і ў некалькіх суседніх вёсках. Але пазней, пад час барацьбы з рэфарматарствам, зборы былі знішчаныя.

У больш позні час у вёсцы была пабудаваная Свята-Прачысценская царква пад гонтавым дахам з двух'яруснай званіцай і царкоўна-прыходскай школай (яе выява захавалася на здымку Я. Балзулкевіча). У 1895 годзе была пабудаваная Свята-Петра-Паўлаўская царква, большая па памерах і з бляшаным дахам.

За кіламетр ад вёскі, там, дзе калісьці была сядзіба, на высокім пагорку ў 1851 годзе была пабудаваная мураваная капліца. Двух'ярусны будынак нагадваў егіпецкую піраміду. У першым ярусе размяшчалася сама капліца, пабудаваная з прыроднага адшліфаванага каменю ў выглядзе васьмігранніка са стрэльчатымі вокнамі пад шатровым дахам з гонты. Унутры была атынкаваная і пабеленая, на металічных бэльках ляжалі падлога і столь. Лесвіца збоку вяла ў ніжні пакой, дзе быў склеп, у нішах якога ў тры ярусы размяшчаліся металічныя труны. Каля кожнай нішы быў невялічкі выступ, дзе можна было паставіць свечку ці паклясці кветкі.

Увосень 1915 года пад час адступлення рускай арміі вёска была спаленая, а жыхары прымусова эвакуяваныя ў глыб Расіі. На месцы паселішча германскія салдаты пабудавалі бліндажы. Паколькі фронт пралягаў па рацэ Сэрвач, за кіламетр ад якой і размяшчалася вёска, то яна перыядычна абстрэльвалася рускай артылерыяй. Частка бліндажоў захавалася і да нашых дзён, астатнія былі разабраныя на падмуркі хатаў. Пасля вайны многія жыхары вярнуліся ў родную вёску і замест яе пабачылі вялізную варонку, парослую хмызняком, з якога выглядвалі бетонныя нямецкія бліндажы. З пабудоваў захаваўся толькі капліца, якую знішчылі праз пяцьдзясят гадоў ужо ў мірны час.

Пасля вяртання бежанцаў вёска пачала аднаўляцца. Нанава былі пабудаваныя хаты, вуліцу выклалі каменным брукам, разбілі сады, набылі жывёлу. Царкву не аднаўлялі, і таму жыхары хадзілі ў суседняе сяло Любанічы, дзе храм быў пабудаваны напярэдадні вайны ў 1914 годзе. Каталікі хадзілі ў касцёл у Варончы, пабудаваны яшчэ ў 1773 годзе. Разам з жыхарамі вярнуўся ў маёнтак і гаспадар, але хутка з'ехаў у Варшаву, пакінуўшы замест сябе аканома.

Увосень 1939 года прыйшлі саветы. Яшчэ да іх прыходу аканом танна прадаў вяскоўцам зямлю і з'ехаў. Пасля яго ад'езду некаторыя вяскоўцы рабавалі сядзібу. Я памятаю некалькі хатаў, печкі ў якіх былі абкладзеныя панскай кафляю. Хутка прыйшла вайна, якая забрала з нашай вёскі 18 жыццяў. У партызаны, праўда, ніхто не пайшоў. Немцы вёску не чапалі. Пад час акупацыі жыццё ў вёсцы працягвалася: аралі зямлю, удзень плацілі падаткі немцам, уначы – партызанам.

Перамены ў вёску прыйшлі пасля вайны – быў арганізаваны калгас «Новае жыццё». Забралі зямлю, інвентар, жывёлу, вяскоўцаў «добраахвотна» ўпісалі ў калгасы. Памятаю, як праз год пасля гэтага ў нас адабралі і гумно. З некалькіх такіх гумнаў зрабілі вялізную пабудову, у якой складвалі лён. Праз нейкі час людзі прызвычаіліся, і калгас ужо не падаваўся нейкім пеклам. Але працаваць за «палачкі» было крыўдна. Каб з сяла не беглі, ажно да 1960-х гадоў маладым не давалі пашпартоў. На ўсю акругу толькі мой бацька тады атрымліваў працоўную пенсію. І каб я магла атрымаць пашпарт, мяне прапісалі ў горадзе, дзе я тады вучылася і жыла ўзімку. Праз нейкі час пачалі браць людзей на розныя працы ў Мінск, і шмат хто з вёскі сталі будаўнікамі і аселі ў сталіцы. У канцы 1970-х разабралі школу, і вучні пачалі ездзіць да суседняга сяла. Быў клуб і хата-чытальня – іх не стала. Вёску прыпісалі да «неперспектыўных».

Калі я яшчэ была дзіцём, памятаю, як людзі хадзілі на царкоўныя святы ў Любанічы. Збіраліся з усёй акругі ды ехалі на вазах і роварах. Напярэдадні мы вымяталі брук, бялілі платы, бацькі абкошвалі траву. Пазней нас у царкву ўжо не пускалі – за гэта і са школы выганялі. Тады ж была спаленая і капліца. Яна згарэла сярод белага дня, ніхто не ратаваў. Пасля ад яе засталіся абгарэлыя бэлькі, праламаная падлога, выцягнутыя з нішаў дамавіны і косці вакол, людскія косці...

Сёння ад вёскі амаль нічога не засталося. На месцы фермы – гурбы смецця, вадзяны млын даўно згніў і дарогі да яго няма. І да рэчкі ніхто не ходзіць, бо яна абмялела і зарасла асакою, ды і хадзіць няма каму. Вёска таксама зарасла пустазеллем, жылых хатаў засталося мала. Хмызняком зараслі і вясковыя могілкі...

Зараз дзяржава ў некаторыя вёскі ўкладвае грошы, будуе аграгарадкі. А што з астатнімі? Што з імі будзе далей?

Ніна МАРЧУК

Музей галіны

Пах лекаў, розныя шклянкі, кубкі, сподачкі, медыцынскія інструменты... Не хвалюйцеся, я запрашаю наведаць не кабінет урача – вы трапілі ў Музей медыцыны. У Беларусі яна мае сваю багатую гісторыю і захоўвае самабытныя традыцыі. Шмат даследчыкаў гісторыі медыцыны спрабавалі адлюстраваць іх у музейных экспазіцыях. Менавіта так і нарадзілася ідэя стварэння спецыялізаванага музея.

Нашчадкі справы Скарыны – лекары

Вытокі музея

Ля вытокаў развіцця музея стаяў прафесар Р.Р. Кручок. Пад ягоным кіраўніцтвам у 1950-я гады ў Мінскім медыцынскім інстытуце была арганізаваная музейная група, афармленыя экспазіцыі, прысвечаныя гісторыі медыцыны Беларусі з 1900 па 1941 гады. І ўжо ў маі 1990 года Міністэрствам аховы здароўя было прынятае рашэнне пра адкрыццё Рэспубліканскага музея гісторыі медыцыны Беларусі.

У музейнай зале

Калі я завітала ў музей, там працавала выстаўка, прысвечаная знакамітаму анколагу-гінеколагу Беларусі Кацярыне Яфімаўне Вішнеўскай. Яна доктар медыцынскіх навук, прафесар, аўтар навуковых працаў і кніг. Гэтая жанчына самаадданая прысвяціла ўсё жыццё прафесіі, працы, навуковай дзейнасці. Яна – уладальніца розных узнагародаў, дыпломаў і медалёў.

Асноўная экспазіцыя музея адлюстроўвае этапы развіцця медыцыны Беларусі са старажытных часоў да пачатку XX стагоддзя. Першы раздзел складаецца з матэрыялаў археалагічных, палеантрыапалагічных і палеапаталагічных даследаванняў. Яны дазваляюць меркаваць аб фізічным развіцці людзей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў старажытныя часы, пра іх захворванні і старадаўнія лекарскія прыёмы. Раздзел паказвае досвед народа і звычаі, скіраваныя на ахову здароўя, што тычацца гігіены харчавання і жылля. Асобнае месца займаюць матэрыялы, якія асвятляюць сувязь старадаўніх вераванняў, рэлігіі з лекамі.

Экспанаты, прысвечаныя развіццю медыцыны ў XVI–XVIII стагоддзях, даюць уяўленне аб распаўсюджванні эпідэміяў і мерапрыемствах па прадухіленні заразных хвароб. Тут можна пазнаёміцца з асаблівасцямі медыцыны Беларусі эпохі Сярэднявечча – хірургічнай дапамогай цырульнікаў, манастырскай медыцынай, дапамогай у шпіталях. Галоўнай асобай раздзела з'яўляецца славуты гуманіст Францыск Скарына – першы доктар медыцыны на беларускіх землях. На адным з твораў мастацтва адлюстравана, як наш суайчыннік атрымаў ступень доктара медыцыны ў Падуі. У экспазіцыі таксама паказаная роля Гродзенскай медыцынскай школы і Віленскага ўніверсітэта (які рыхтаваў і ўрачоў), пададзеныя выявы выкладчыкаў і выпускнікоў розных медыцынскіх навучальных установаў Беларусі.

Наступны раздзел асвятляе характэрныя рысы медыцыны Беларусі ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Паказаны санітарна-гігіенічны стан Беларусі, узровень здароўя насельніцтва, развіццё супрацьэпідэмічных установаў, дзейнасць першых санітарных урачоў. Тут можна даведацца і пра арганізацыю аптэчнай справы, дасягненні ў галіне акушэрства і гінекалогіі, тэрапіі, хірургіі, афтальмалогіі ды інш.

Працуе ў музеі выстаўка «Медыцына Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны». З яе можна даведацца не толькі аб прафесійнай дзейнасці медыкаў на фронце і на акупаванай тэрыторыі, але і пра медыцыну ды санітарыю ў партызанскіх атрадах. Тут жа арганізаваны і прагляд дакументальнага фільма.

Ганна ЯКІМОВІЧ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

«Евангелле ад жыцця»

Напярэдадні праваслаўнага Нараджэння Хрыстова на выстаўках «Рождество Христово» ў Мінску і «Рождественский дар» у Маскве адбыліся прэзентацыі першага знятага ў Беларусі праваслаўнага мастацкага фільма «Притчи».

Рэжысёр фільма Віталь Любецкі, чые працы адзначаныя на шматлікіх кінафэстах, аператар-пастаноўшчык – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Тацяна Логінава, якая здымала вядомыя беларускія мастацкія фільмы «Чорны замак Альшанскі», «Знак бяды», «Інсайт», «Анастасія Слуцкая». Музычнае суправаджэнне і гукавы шэраг, што надзвычай удала павялічваюць выразнасць выяваў і апавядання, падрыхтаваў беларускі кампазітар Вадзім Сажын.

Фільм зняты студыяй імя Св. Спаведніка Іаана Воіна творчай майстэрні Свята-Елізавецінскага жаночага манастыра ў Мінску. Праца над фільмам доўжылася з красавіка па лістапад мінулага года. Здымкі праходзілі як у самім манастыры, так і, часткова, у Мінску. Мантаж, у асноўным, выкананы на студыйным абсталяванні.

У аснову фільма пакладзеныя тры прыпавесці з пісанняў святых айцоў – «Незвычайны послух», «Нямая малітва» і «Як Хрыстос у госці хадзіў», праілюстраваныя прыкладамі з сучаснага жыцця. Здымаліся ў стужцы беларускія акцёры: народны артыст Беларусі Аляксандр Ткачонак, Міхась Есьман, Алена Сідарава. Як вобразна выказалася глядачка з Масквы Кацярына Малышава, экранізаваныя прыпавесці – гэта своеасаблівае «Евангелле ад жыцця».

Відэастудыя створаная ў 2005 г. на базе аўдыястудыі, што займалася вытворчасцю

Пад час сустрэчы са здымачнай групай

запісаў праваслаўнай тэматыкі. На ёй працуе больш за 20 чалавек: аператары, рэжысёры, манашкі. Кіраўніком студыі з'яўляецца манахіня Іаана (Арлова). Першай яе рэжысёрскай працай стаў фільм «Путём любви», які выйшаў у 2006 г. і прысвечаны Свята-Елізавецінскаму жаночаму манастыру. За час існавання выпушчана больш за 15 дакументальных фільмаў духоўна-асветніцкай тэматыкі, а напрыканцы 2010 г. – першы мастацкі «Притчи».

Фільмы студыі былі актыўнымі ўдзельнікамі міжнародных конкурсаў негульнявога кіно, намінанты і дыпламанты кінафестываляў. Сярод узнагародаў – першая прэмія ў конкурсе негульнявога кіно «Покров» у Кіеве за фільм «Братия», прыз за лепшы аўтарскі негульнявы фільм 2009 г. на міжнародным фестывалі «Артдокфест» у Маскве за фільм «Главная роль», прэмія фестывалю хрысціянскага кіно ў Трэнта (Італія) – «Лампа не гаснет». Дэманструюцца фільмы і на праваслаўных кірмашах па ўсім СНД, на беларускім тэлебачанні. Цяпер жа студыя працуе над першым адукацыйным анімацыйным фільмам для дарослых «Православная азбука».

Манахіня Іаана

Як бачым, у нас пачало з'яўляцца сваё праваслаўнае кіно. Праўда, сваё пакуль толькі паводле месца стварэння. Але прыйдзе час...

Зм. ВОЖЫК
Фота аўтара

Не ўціхай, мая памяць

Гадоў дзесяць таму мне вельмі захацелася ўбачыць вёску Хацінаў Любанскага раёна, дзе нарадзілася мая маці. Яна з бацькам ездзіла туды да маіх бабулі і дзядулі Чайкоўскіх. Мне тады было гадкоў трычатыры, і ў памяці ні вёска тая, ні нават хата, дзе нарадзілася маці, не адкладаліся. Але калі праз столькі гадоў, стаўшы пенсіянерам, я ступіў на вуліцу той вёскі, то адчуў такі прыліў у душу нейкай светлай радасці, што кожнае дрэва ўзбоч шырокай вуліцы здавалася мне родным, хоць на тым месцы, дзе стаяла бабуліна хата, ужо не было ні дрэўца, ні кусціка. Але радасць сустрэчы з гэтай вёскай не пакідала мяне, і калі выйшаў з яе, каб прыгарадным аўтобусам ехаць да мястэчка Урэчча, адчуванне ў душы было такое, нібы я выйшаў з царквы пасля споведзі. І падалося, што тую радасць мне падарыла вёска нездарма: вучоныя ўжо схільныя лічыць, што душы памерлых могуць час ад часу сыходзіць з нябёсаў на зямлю, наведваць любыя ім прыжыцці мясціны.

...Замуж маці выйшла за васямнаццацігадовага хлопца з вёскі Кутнёў Старобінскага раёна, які пасля смерці сваіх маці (ад «іспанкі») і бацькі (ад запалення лёгкіх) застаўся з дзесяцігадовай сястрой Волькай. Ад бацькі, Майсея Феафілавіча, меў чатыры гектары ворнай зямлі і столькі ж сенажаці за дваццаць кіламетраў ад вёскі, карову, каня, авечак. Далёкі сваяк па матчынай лініі Іван Старжынскі павёз яго ў вёску Хацінаў – на водведкі да дзяўчыны Марыі, якая была на год старэйшая за яго. Сустрэча, агледзіны былі нядоўгія – дзяўчына дала згоду на шлюб.

Пайшлі дзеці: да калектывізацыі ў хаце былі ўжо тры сыны ад шасці да паўтара гадкоў. Добра, што поруч была бацькава сястра Волька, якая, як магла, даглядала дзяцей, бо бацькі з ранку да вечара шчыравалі на загонах. Неўзабаве я, чатырохгадовы, наступіў босай нагою на касу, якую бацька зняў з касільна, паклаў на прызбу, а сам кудысьці выйшаў. З парэзанай ступні біла фантанчыкам кроў. Бацька схапіў «касца» на рукі і паімчаў у мястэчка Пагост, што за тры кіламетры ад вёскі. Доктар у амбулаторыі наклаў на рану швы. А праз нейкі час мой старэйшы брат Тоня ўсунуў руку ў сячкарню, што стаяла каля гумна, а я стаў, як мог, раскручваць кола ад яе – і вострае лязо прарэзала яму скуру. Зноў плач маці, і бацькавая ношка ў той Пагост...

А потым, пасля ўступлення ў калгас, бацьку запрасілі ў Старобін, у тутэйшы аддзел ГПУ. Там яго ў нейкім хлеўчуку разам з іншымі вяскоўцамі трымалі аж два тыдні на галодным пайку – выбівалі на допытах залатыя манеты. Быў такі загад вышэйшай улады. Маці насіла перадачу, але яе не прынялі. Праз тры гады за тыя некалькі не здадзеныя добраахвотна манеткі бацьку зняволілі. Не пашкадавалі і чацвёра малых дзяцей, што засталіся без бацькі.

Але маці мела рашучы, актыўны характар, дабілася, каб з бацькі знялі судзімасць, і ён выйшаў са Слуцкай турмы. Толькі жыць у гэтак званай «прыгранічнай зоне», што пралягала ад заходняй мяжы на сто кіламетраў, яму не дазволілі. Бацька атабарыўся ў Бабруйску, працаваў на нейкім заводзіку, закончыў курсы шафёраў. Пяць з паловай гадоў зрэдку, толькі ўначы, вяртаўся дамоў наведаць дзяцей, жонку.

Усе клопаты ў хаце і вакол яе ляжалі на матчыных плячах. У чатыры гадзіны раніцы ўставала, каб падаіць карову і выгнаць на пашу, выпаліць у печы і сёе-тое згатаваць. Потым, на хаду з'еўшы пару дранікаў з малаком, ішла на калгаснае поле, каб зарабіць нейкі працадзень, за які ў канцы года маглі выдаць грамаў чатырыста зерня і кіло бульбы. Але мы, дзеці, ніколі не чулі ад маці скаргаў, словаў адчаю, яна была да кожнага з нас ласкавая. У 1938 годзе ў хаце ўжо было шасцёра дзяцей. Хіба не балела ў маці сэрца за іх, падчас галодных, на нішчымніцы, бо хлеб на стале не часта быў, затое лебяду з крапівою мы не раз елі, закусваючы варанаю бульбай.

Толькі зімой 1940 года, калі прыгранічная зона адсунулася да Брэста, бацька змог вярнуцца дамоў, працаваць шафёрам у Слуцку, а дагэтуль маці адна цягнула нялёгкі сямейны воз. А колькі бяссонных начэй перажыла яна з вясны 1943-га па ліпень 1944-га, калі амаль кожны тыдзень яе будзіў моцны стук ботамі ў дзверы і голас: «Хозяин, открой!»

Бацька і брат Тоня, якому тады было сямнаццаць гадоў, не начавалі ў хаце – зладзілі схованку ў гумне. Сустракала партызанаў маці адна з малымі дзецьмі. Запальвала лямпу ці газніцу і глядзела моўчкі, як госці шнырылі па вуглах, заглядвалі ў шафу, уздымалі вечка куфра, каб нешта выбраць для сябе. Або патрабавалі самагонкі, лаяліся, калі маці адказвала, што няма яе. Аднойчы вясной 1943 года я прыйшоў з гумна, дзе заначаваў, і ўбачыў маці ў слязах, з дрыготкімі рукамі. Яна расказала, што ўначы завітаў партызан – ураджэнец суседняй вёскі Мялешкі Пятрусь Праневіч са сваім сябруком рускім. Яны запатрабавалі, каб маці аддала ім хромавую тужурку, якую ў нас ніколі ніхто не бачыў – яе не было. Тады Праневіч вывеў маці ў двор, дастаў з ножнаў шырокі нямецкі штык, прыставіў яго да шыі жанчыны і спытаў: «Что тебе, стерва, дороже: жизнь или тужурка?» І толькі калі маці з плачам сказала марадзёру, што з яго малодшым братам Антосем яе сын разам да вайны сядзеў за партай у Мялешкаўскай школе, а дзеці прачнуліся і закрычалі, кат адпусціў яе. А колькі было начных і дзённых візітаў немцаў, паліцаяў, мадзьяраў – і ўсіх трэба было сустракаць, цярпець абразы, пагрозы, марадзёрства! А колькі гора прынесла ёй зімою 1945 года вестка з ваенкамата, што яе сын Антон Тычына прапаў без вестак? Толькі ў 1970-я гады я даведаўся, што брат загінуў 17 студзеня таго ж года ў баях за Варшаву і там пахаваны.

Больш за паўвека мінула, але як сёння памятаю маці, калі яна ляжала на шырокай лаве, і васковая свечка гарэла ў галавах, і рукі яе, спрацаваныя на калгасных палетках і дома, ляжалі на грудзях – нібы два пярэвяслы на полі жніва. Не забыць, які прасветлены, без адзінай маршчынкі, такі маладжавы (маці трагічна памерла ў 47-гадовым узросце) быў яе твар. І не хацелася верыць, што яна хутка пакіне назаўсёды і сваю хату, і пяцёра дзяцей, і яшчэ не старога мужа-калгасніка. Запрошаны са Слуцка святар адпяваў нябожчыцу – і гэта яшчэ болей нагадвала пра нашае хуткае развітанне назаўсёды. І прыпамінаюцца мне цудоўныя, кранальныя да слёз радкі з «Паэмы жніва» вядомай беларускай паэткі Ніны Мацяш, прысвечаныя памяці яе таксама рана памерлай маці:

А ты ж і не ведаеш, мама,
што з табой адбылося,
Не ведаеш нават, што ўсё,
з чым зжывалася ты, чым жыла,
ад цябе адцялося.
Што раптам пайшлі ад цябе
ўсе дарогі твае і сцяжыны.
Пакінулі усе – па пяклівай расе,
па іржэўніку, па ажавінні.
Не ўціхай толькі, памяць
мая здратаваная,
Прытаўчу, прытапчу безнадзей
гадаўё...
Свецяць, мамачка, рукі твае
спрацаваныя,
Мама, свеціць трывушчае
сэрца тваё.

Міхаіл ТЫЧЫНА

Зімовы спорт

Уздоўж

5. Краіна, радзіма хакея з шайбай. **6**. Спартсмен-аматар, ці .... **9**. Спартыўная гульня з ракеткамі і валанам. **10**. Дэталь абарончага рыштунку варатароў-хакеістаў. **12**. Від спорту: лыжныя гонкі са стральбой з вінтоўкі. **15**. Горад у ЗША, дзе ўпершыню ў 1938 г. быў пабудаваны Палац спорту. **16**. Алімпійскі спартыўны комплекс непадалёк Мінска. **17**. Спартыўныя кіруемыя санкі з абцякальнікам. **18**. Тое, што і па-за гульнёй. **19**. У даўнія часы на Беларусі рамеснік, які не ўваходзіў у рамесны цэх. У асяроддзі балельшчыкаў – мянушка няўдалага хакеіста, футбаліста (разм., слэнг). **22**. Суддзя на полі, пляцоўцы. **25**. Элемент парнага фігурнага катання на каньках. **29**. Пакарыцель горных вышыняў. **30**. Старт да сігналу суддзі-стартара. **31**. Буйны горад у Аўстраліі, дзе ў 2000 г. праводзіліся Алімпійскія гульні. **32**. Становішча гульца па-за гульнёй.



Упоперак

1. Выкананне спартсменамі комплексу фізічных практыкаванняў перад спартыўным спаборніцтвам ці трэніроўкай. **2**. Горад у Францыі, дзе адбыліся І Алімпійскія гульні. **3**. Выстрал міма мішэні, цэлі, ці ў .... **4**. Вузкая лёгкая лодка без уключынаў. **7**. Месца, куды заганяюць шайбу. **8**. Дарога, пракладзеная прама па снезе для язды зімой. **11**. Кармавая частка верхняй палубы судна. **13**. Рэспубліканскі цэнтр падрыхтоўкі беларускіх спартсменаў па зімніх відах спорту. **14**. Буйное злучэнне ваенных караблёў. **20**. Скачок у фігурным катанні на лёдзе. **21**. Спартыўнае збудаванне на лыжнай трасе. **23**. Від лыжнага спорту. **24**. Запасны склад спартсменаў на спартыўных спаборніцтвах. **26**. Штучны вадаём для плавання. **27**. Слова; абазначае здзіўленне, аблягчэнне. **28**. Нашыўка, якая прыкрывае кішэню.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск

«Пераначуем, болей пачуем» *і іншае*

Прыказка «Пераначуем, болей пачуем» паводле свайго паходжання – уласна беларуская. У літаратурную мову яна прыйшла з народных гаворак, дзе яе ўпершыню амаль адначасова занатавалі ў розных мясцінах Беларусі Я. Чачот (1846) і Я. Тышкевіч (1847). Фіксуецца яна і ў працах іншых збіральнікаў вуснай народнай творчасці – І. Насовіча, М. Федароўскага. І. Насовіч, у адрозненне ад іншых фальклярыстаў, імкнуўся даць дакладнае тлумачэнне сэнсавага зместу той ці іншай прыказцы, пачутай ім у жывой народнай мове. У яго «Зборніку беларускіх прыказак» (1847) парэмія «Пераначуем, болей пачуем», па сутнасці, атрымала дваякае тлумачэнне: «Время всё откроет. Утро вечера мудренее».

Гэтая прыказка і ў сучаснай літаратурнай мове мае два значэнні. Па-першае, яна гаворыцца з надзеяй пачуць у бліжэйшы час штонебудзь новае. Да прыкладу, у п'есе К. Крапівы «З народам» чытаем: [*Броня*:] *І сёння нейкага чына хавалі. Кажуць, ля Рудзенска недзе партызаны ўходалі.* [*Гудовіч*:] *Ну вось! А ты казала, няма добрых навін.* [*Броня*:] *Дык гэта мала.* [*Гудовіч*:] *Пераначуем, болей пачуем.* Або ў аповесці І. Новікава «Тварам да небяспекі»: – *Можа, заўтра яшчэ пагаворым? – спытала на развітанне Ганна. – Бадай што не. Раненька еду. – Ну што ж, пераначуем – болей пачуем.*

Па-другое, яна абазначае «раніцай прыйдзе больш правільнае рашэнне (кажуць пры адкладванні рашэння чаго-небудзь на заўтрашнюю раніцу, калі ўсё стане ясней, больш відаводчным)». Напрыклад: – *Дык пойдзем заўтра ў Крычаў ай не?.. – Пераначуем – болей пачуем, – адказвала Палага* (І. Чыгрынаў); *Надзя заспяшалася, напаследак сказала: – Заўтра яшчэ пагамонім – праначчуем, болей пачуем* (І. Капыловіч).

У нашых акадэмічных перакладных даведніках чамусьці не ўлічваецца двухзначнасць гэтай прыказкі. Так, у «Руска-беларускім слоўніку» (1982, т. 2, с. 545) знаходзім такі пераклад з адной мовы на другую: «утро вечера мудренее – пераначуем, болей пачуем». Такі ж, толькі адваротны пераклад даецца ў «Беларуска-рускім слоўніку» (1898, т. 2, с. 196): «пераначуем, болей пачуем – утро вечера мудренее». Следам за гэтымі слоўнікамі тое самае паўтараецца ў многіх іншых працах; напрыклад, у кнізе Ф. Янкоўскага «Беларуская мова» (1978, с. 103), у «Малым руска-беларускім слоўніку прыказак, прымавак і фразем» З. Санько (1991, с. 45). Як ужо было паказана вышэй, такі пераклад мог бы дастасоўвацца толькі да другога значэння прыказкі «Пераначуем, болей пачуем», але не да першага. Мог бы дастасоўвацца, калі б у нашай літаратурнай мове не прыжылася і паўкалька з рускай мовы «Раніца мудрэйшая (мудрэй) за вечар», якая выступае як абсалютны сінонім да другога значэння беларускай прыказкі. Гэтую паўкальку запісаў у 1898 годзе і Я. Ляцкі ў сваіх «Матэрыялах для вывучэння творчасці і быту беларусаў» (с. 52).

Ужыванне ж паўкалькі «Раніца мудрэйшая (мудрэй) за вечар» пацвярджаецца ў «Слоўніку беларускіх прыказак» (2006, с. 357) шматлікімі цытатамі з тэкстаў І. Шамякіна, П. Місько і іншых. Вось толькі дзве з іх: *Давай падрэмлем... А то хто ведае, што чакае нас заўтра. Ды і раніца, кажуць, мудрэй за вечар* (Б. Сачанка); *Так у нас гаворыцца спрадвечна: «Раніца мудрэйшая за вечар». І мы пагаджаемся з такою памоўкаю, лічым звычайнаю справай, калі адкладваюцца на заўтра незакончаныя справы* (Я. Крупенька).

Іван ЛЕПЕШАЎ,
прафесар

Ігар Пракаповіч

Назвы нашых вёсак

(Працяг. Пачатак у №№ 30–35, 39–48 за 2010 г. №№ 1–2 за 2011 г.)

Рудае – вёска за 30 км на ўсход ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Варапаева. Вядомая з пачатку XX стагоддзя ў Луцкай воласці Дзісненскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе было 3 вёскі з назвай Рудая. Мела формы Руда, Рудка. Назва паходзіць ад славянскага *«руды»* ў значэнні «рыжа-карычневы, чырванаваты, рыжы». Спачатку назва вызначала асаблівасць мясцовасці, а потым перайшла на вёску. Рыжа-карычневы колер звязаны з афарбоўкай балотнай вады з прычыны таго, што ў ёй знаходзіцца шмат ліманіту – балотнай жалезнай руды. Ад асновы «руды» на Пастаўшчыне ўтворана шмат прозвішчаў людзей: Руды, Рудаў, Рудык, Рудак, Рудзяк, Рудніцкі, Руднеў, Рудкоўскі, Рудзік.

Рудзевічы – вёска за 13 км на ўсход ад Паставаў. Вядомая з 1873 года ў Лучайскай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні. Назва паходзіць ад прозвішча *Рудзевіч*, якое ёсць у спісе беларускай шляхты. Гл. таксама Рудае.

Рудзі – вёска за 7,5 км на захад ад Паставаў, за 8 км на паўночны ўсход ад Камаяў. Назва паходзіць ад прозвішча *Рудзь*, у аснове якога мянушка чалавека, які меў адметнасць – быў рудым (рыжым). У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Рудзік, Рудзінскі.

Рудка – вёска за 30 км на ўсход ад Паставаў, за 7 км на ўсход ад Варапаева. Вядомая з 1782 года як фальварак на 77 двароў. Назва паходзіць ад славянскай асновы *«руды»* – «рыжа-карычневы» і першапачаткова адносілася да рэчкі або да возера, якое мела такі колер вады. Афарбоўка залежыць ад грунтоў, у якіх мелася шмат гліністых часцінак або аржавіння – балотнай руды. Раней каля вёскі знаходзілася цагельня, дзе з мясцовай гліны выраблялі чырвоную цэглу.

Русак*і* (1) – вёска за 19 км на паўднёвы захад ад Паставаў, за 6 км на поўдзень ад Камаяў. Вядомая з 1873 года як вёска ў казённым маёнтку ў Камайскай воласці Свянцянскага павета Віленскай губерні. У 1905 годзе вёска і засценак Сівіцкага. Назва-этнонім адлюстроўвае этнічны склад насельніцтва вёскі. Пераважная большасць жыхароў былі *«русакамі»* – рускімі па нацыянальнасці. Назва сведчыць і пра тое, што ў вакольных вёсках жыло не рускае насельніцтва – магчыма, балты або ліцьвіны. У Пастаўскім і Мядзельскім раёнах вельмі пашыраным з'яўляецца прозвішча *Русак,* сустракаецца таксама Русакевіч, Русалоўскі.

Русак*і* (2) – вёска за 8 км на поўнач ад Паставаў на правым беразе ракі Мядзелкі. Тлумачэнне назвы гл. *Русакі (1).*

Русіны – вёска за 10 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. У 1873 годзе знаходзілася ў Манькавіцкай воласці Вілейскага павета, уладанне Хлявінскай. Назва адлюстроўвае этнічны склад насельнікаў паселішча. У старажытнасці *«русінам»* звалі любога, хто належаў да славянскіх плямёнаў. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Русінаў, Русецкі.

Рыбч*а*ны – вёска за 7 км на поўнач ад Паставаў на левым беразе ракі Мядзелкі. Назва паходзіць ад славянскага дзеяслова *«рыбачыць»* – «лавіць рыбу». Назва адлюстроўвае занятак жыхароў. Верагодна, тутэйшыя людзі вызначаліся сваімі рыбацкімі ўменнямі, адкуль і пайшла гэтая назва-мянушка. *Рыбчане* – людзі, што займаліся рыбай.

Р*ы*лькі – вёска за 16 км на паўднёвы ўсход ад Паставаў. У 1873 годзе – засценак у Манькавіцкай воласці Вілейскага павета Віленскай губерні, уладанне Тызенгаўзаў. Назва, верагодна, паходзіць ад старажытнаславянскага *«рълка»* – «водмель»; *«рель»* – «поплаў». Слова сустракаецца ў навагародскіх граматах з XII стагоддзя ў блізкіх значэннях: «заліўны сенакосны луг», «невялікае ўзвышша сярод балот». Вёска знаходзіцца каля вялікай забалочанай поймы прытоку ракі Аржоўкі.

(Працяг на стар. 8)

(Працяг. Пачатак на стар. 7)

Царква у Рымках
Фота аўтара

Рымкі – вёска за 34 км на паўночны ўсход ад Паставаў, за 19 км на поўнач ад Варапаева. Вядомая з 1873 года ў Пастаўскай воласці Дзісненскага павета, належала Тызенгаўзу; у пачатку XX стагоддзя – Пшаздзецкім. Улічваючы тое, што вёска знаходзіцца ў сутоках трох, раней суднаходных, рэк – Дзісны, Паловіцы і Галбяіцы, то можна з вялікай доляй верагоднасці растлумачыць паходжанне назвы ад тэрміна *«рым»* – «металічнае кола для замацавання тросаў, блокаў, швартовых канцоў, якое ўсталёўваецца ў насавой і кармавой частках караблёў, а таксама на прычалах і набярэжных». Гэтае германскае слова магло быць прынесенае ў тутэйшыя мясціны ў раннім сярэднявеччы, калі па рэках праходзіў водны гандлёвы шлях з басейна Заходняй Дзвіны ў басейн Нёмана. Не выключана, што назва паселішчу была дадзеная вікінгамі, якія ў даўнія часы часта хадзілі па рэках паўночна-заходняй Беларусі і Балтыі. У месцы злучэння трох рэк і быў *«рым»* – «прыстань; месца для прывязвання караблёў да металічных кольцаў». Можна прапанаваць і прасцейшае тлумачэнне назвы: *Рыма (Рымка, Рымша)* – кананізаванае імя, якое ў лацінскай мове азначае «кінуты». Можа, назва вёскі пайшла ад імя першапасяленца з імем Рыма. У Пастаўскім раёне сустракаецца шэраг прозвішчаў, утвораных ад гэтага імя: Рымша, Рымко, Рымовіч.

Рынкяны – вёска за 34 км на захад ад Паставаў, за 8 км на поўнач ад Лынтупаў. У пачатку XX стагоддзя была ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета. Тлумачэнне паходжання назвы можна знайсці ў фінскіх мовах, дзе *«rinne»* – «схіл, спуск», а *«kanta»* – «галава, вяршыня». Разам атрымліваецца апісанне адметнасці мясцовасці – «вяршыня схілу». Такое тлумачэнне пацвярджаецца геаграфіяй, бо вёска знаходзіцца на ўзвышшы каля паглыбленай даліны ракі Свілы. Як варыянт можна прапанаваць тлумачэнне назвы ад германскай асновы *«рынк»* – «кола, кольца», якое ў сярэднявеччы трансфармавалася ў *«рынак»* – «гандлёвую плошчу». Звестак пра тое, што ў даўнейшыя часы Рынкяны былі гандлёвым цэнтрам, не знойдзена, але ўскосныя доказы гэтага існуюць. У адрозненне ад суседніх сельскіх населеных пунктаў, размешчаных уздоўж дарог, Рынкяны вызначаюцца тым, што сюды сходзіцца пяць шляхоў. У Пастаўскім раёне жывуць людзі з прозвішчам Рынкевіч.

Рэдзькаўшчына – вёска за 35 км на ўсход ад Паставаў каля Варапаева. Назва патранімічная, паходзіць ад прозвішча *Радзька (Рэдзька)*, якое ўтварылася ад кананічнага праваслаўнага імя *Радзівон (Родион)*, што з грэчаскай мовы азначае «герой, гераічны чалавек». Імя ўтварае шматлікія формы, сярод якіх сустракаюцца Радзька, Радко, Радзько, Родзька і іншыя. Фармант «-шчына» паказвае, што тутэйшая мясцовасць належала гаспадару з імем Рэдзька. У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы, утвораныя ад гэтай формы імя Радзівон: Радзько, Радкевіч, Радзьковіч.

Рэдута – вёска за 28 км на захад ад Паставаў, за 6 км на паўднёвы ўсход ад Лынтупаў. Вядомая з 1790 года як вёска з 13 дымоў. У 1873 годзе вёска ў Лынтупскай воласці Свянцянскага павета, уладанне Канткоўскай. Найпрасцей растлумачыць назву з французскай мовы, дзе *«redoute»* – гэта «палявое земляное ўмацаванне, акружанае валам і ровам», і звязаць яе ўтварэнне з падзеямі вайны 1812 года, калі французскія войскі праходзілі праз гэтую мясцовасць ў час паходу на Расію. Існуе легенда, што такую назву вёсцы даў мясцовы памешчык, які сам быў удзельнікам тых гістарычных падзеяў. Але, верагодна, назва ўтварылася значна раней ад асновы, блізкай да словаў *«род, рада, радавод, радня»*, тым больш, што ў вымаўленні яна часцей гучыць як «Радута». Пра старажытнасць і сакральнасць назвы сведчаць раннехрысціянскія могілкі і магчымае існаванне капішча. У пачатку XXI стагоддзя на гэтым месцы рупнасцю мастака Алеся Цыркунова ўсталяваная каплічная брама.

Рэпішкі (Рэпешкі) – хутар за 28 км на захад ад Паставаў, за 5,5 км на ўсход ад Лынтупаў. Назва паселішча паходзіць ад назвы расліны «рэпік» (рус. «репей») – «род шматгадовых травяністых раслінаў сямейства складанакветных, якія маюць звычайна калючкі». Найбольш вядомым прадстаўніком віду з'яўляецца лопух. Урочышчы з такімі раслінамі заўважаліся мясцовымі жыхарамі і часта ўводзіліся ў тапанімію. У Беларусі шырока распаўсюджаныя назвы «Рэпішча», «Рэпнікі». У Пастаўскім раёне сустракаюцца прозвішчы Рэпін, Рэпнікаў.

(Працяг будзе)

Імпрэза

Майстар і настаўнік Арцімовіч

Першай выстаўкай новага года ў мінскім Музеі сучаснага мастацтва стала групавая экспазіцыя скульптуры, прысвечаная 70-годдзю выдатнага беларускага скульптара-манументаліста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесара акадэміі мастацтваў Анатоля Яўхімавіча Арцімовіча, які ў верасні 2010 г. адзначыў свой юбілей.

Назва ў выстаўкі невыпадковая. «Узбагачацца адзін ад аднаго» – прынцып стасункаў Анатоля Яўхімавіча са сваімі калегамі, вучнямі, сябрамі. У экспазіцыі прадстаўленая фотарэтраспектыва творчага шляху А. Арцімовіча ў манументальных творах і ўпершыню – дзве мінулагоднія станкавыя працы «Посвящение Куропатам» і «Свобода». Разам з ягонымі працамі прадстаўленыя творы 35 скульптараў, якія ў розныя гады былі яго вучнямі і калегамі.

У слове на адкрыцці выстаўкі калега па кафедры вядомы скульптар

А. Арцімовіч. «Свабода»

Уладзімір Слабодчыкаў ахарактарызаваў Анатоля Яўхімавіча як рознабаковую асобу: вучонага, аналітыка, філосафа, паэта, а таксама – шчырага, тонкага і ўразлівага творцу. Было таксама пажаданне юбіляру выпусціць кнігу сваіх вершаў.

Сярод працаў скульптара – помнікі Францыску Скарыну ў Калінінградзе, Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі, Ефрасінні Полацкай у Мінску, князю Барысу ў Барысаве ды іншыя.

С. АЛАВЕЙКА,
фота аўтара

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

Пачатак у № 1 за 2003 год)

ЛА́ЗЬБЕНЬ – лубяны посуд з векам (часам з мяккім палатняным дном) і почапкай для складвання мядовых скрылёў у час медазбору. Называўся таксама лабзень, лубачка. У некаторых мясцовасцях выступаў у якасці адзінкі падатковага абкладання (сяляне Слонімскага староства ў XVI–XVII стст. за карыстанне бортнымі дрэвамі ў скарбовым лесе плацілі 25 грошаў з лазьбень).

Лазьбень

ЛА́ЗЬБІНЫ – частаванне ў дзень асноўнага медазбору. У мінулым звычай быў пашыраны сярод пчаляроў, якія трымалі супольных пчолаў. Запрашаліся сваякі, сябры, бліжэйшыя суседзі. За святочны стол садзіліся пасля падгляду пчол, падрэзкі і размеркавання мёду паміж супольнікамі. З дакладнай этнаграфічнай верагоднасцю лазьбіны апісаў Я. Колас у паэме «Новая зямля» (раздзел «Падгляд пчол»).

ЛА́ЙБА – хадавое пласкадоннае судна (лодка) з ветразем, без палубы і даху. Нос і карма завостраныя. Даўжыня 25–30 м, шырыня 4–5 м, грузападымальнасць 24–80 т. Вядомыя з XV ст., спачатку – лёгкія ўстойлівыя лодкі. З часам удасканальваліся і павялічваліся ў памерах. Шырока выкарыстоўваліся да пачатку XX ст.

ЛАНДША́ФТНАЯ АРХІТЭКТУ́РА – мастацтва гарманічна спалучаць ландшафтныя прыродныя ўмовы і створаныя чалавекам элементы ландшафту. Уключае садова-паркавае мастацтва, сядзібна-паркавыя ансамблі, азеляненне і водны ландшафт. У Беларусі як асобная галіна вылучаецца з 1960-х гг. Сродкі ландшафнай архітэктуры выкарыстаныя пры стварэнні мемарыяльных (Хатынь і Дальва ў Лагойскім, Курган Славы ў Смалявіцкім, Зыслаў у Любанскім р-нах, урочышча Гай каля Баранавічаў і інш.) і рэкрэацыйных (воз. Нарач, Заслаўскае вадасх.) комплексаў, водна-зялёных сістэмаў гарадоў (Мінска, Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна), будаўніцтве аўтамабільных дарог, асобных архітэктурных аб'ектаў (спартыўны комплекс у Раўбічах Мінскага р-на).

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Камунальная набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26, 334 61 62. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 20.01.2011. Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 69. Тыраж 1190 асобнікаў.